*Пролетарыі ўсіх краін, єднайцеся!*

# ПЕРАМОГА

ОРГАН АНТОПАЛЬСКАГА РК КП (б) Б І ВЫКАНКОМА РАЙСОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ.

№ 56 (70) | Субота, 24 лістапада 1945 г.

## Вернаму саратніку Леніна і Сталіна— Міхаілу Іванавічу Калініну

Дарагі Міхаіл Іванавіч!

Цэнтральны Камітэт Усесаюзнай Комуністычнай Партыі (большэвікоў) і Совет Народных Камісараў Саюза ССР сардэчна вітаюць Вас у дзень Вашага 70-годдзя.

Совецкі народ высока цэніць Вашы заслугі перад Радзімай, як аднаго з відных арганізатараў і будаўнікоў комуністычнай партыі і Совецкай дзяржавы. Усё сваё свядомае жыццё—больш 50 год—Вы аддалі рэволюцыйнай барацьбе за інтарэсы рабочых і сялян. Вы былі заўсёды стойкім паслядоўнікам і верным саратнікам Леніна і Сталіна.

Больш 26 год Вы з'яўляецеся кіраўніком Вярхоўнага органа Совецкай дзяржавы. Знаходзячыся на гэтым пасту, Вы ўсе гэтыя годы аддавалі свае сілы, веды і багаты жыццёвы вопыт рэволюцыянера-большэвіка справе ўмацавання саюза рабочых, сялян і інтэлігенцыі, умацаванню дружбы паміж народамі Совецкага Саюза. На гэтай рабоце па ўзмацненню і ўзвышэнню Совецкай дзяржавы Вы заслужылі глыбокую павагу ўсёй партыі і гарачую любоў працоўных нашай краіны.

У Вашай асобе партыя большэвікоў, народы Совецкага Саюза чэствуюць сёння дзяржаўнага дзеяча ленінска-сталінскага тыпу, прынцыповага, простага і сардэчнага, роднага шырокім масам совецкіх рабочых, сялян і інтэлігенцыі.

Ад усёй душы жадаем Вам, дарагі Міхаіл Іванавіч, многіх год здароўя для плённай работы на карысць нашай вялікай Радзімы.

**Цэнтральны Камітэт Усесаюзнай Комуністычнай Партыі (большэвікоў).**

**Совет Народных Камісараў Саюза СССР.**

---

## УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

### АБ УЗНАГАРОДЖАННІ СТАРШЫНІ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА САЮЗА ССР ТАВАРЫША МІХАІЛА ІВАНАВІЧА КАЛІНІНА ОРДЭНАМ ЛЕНІНА

За выдатныя заслугі ў справе будаўніцтва і ўмацавання Совецкай дзяржавы ўзнагародзіць Старшыню Прэзідыума Вярхоўнага Совета Саюза ССР таварыша Міхаіла Іванавіча Калініна ў дзень яго 70-годдзя ордэнам Леніна.

**Намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР— Н. Швернік.**

**Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР— А. Горкін.**

Масква, Крэмль.
19 лістапада 1945 года.

## Рэспубліканская выбарчая камісія па выбарах у Совет Нацыянальнасцей

Прэзідыум Вярхоўнага Совета Беларускай ССР зацвердзіў рэспубліканскую выбарчую камісію па выбарах у Совет Нацыянальнасцей у саставе наступных прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных:

Старшыня рэспубліканскай выбарчай камісіі В. І. Казлоў —ад Мінскай комуністычнай арганізацыі; намеснік старшыні К. М. Міцкевіч (Якуб Колас) —ад саюза совецкіх пісьменнікаў Беларускай ССР; сакратар выбарчай камісіі В. І. Закурдаеў—ад прафесіянальнага саюза работнікаў палітасветустаноў БССР.

Члены рэспубліканскай выбарчай камісіі: Т. С. Гарбуноў—ад комуністычнай арганізацыі БССР; М. В. Зімянін—ад Ленінскага Комуністычнага Саюза Моладзі Беларусі; В. І. Захарэвіч—ад прафесіянальнага саюза работнікаў пачатковых і сярэдніх школ БССР; Т. Ф. Дрэмлюк —ад сялян вёскі Мінковічы, Смаргоньскага раёна, Маладзечненскай вобласці; Е. С. Казакова—ад рабочых, служачых і інжынераў Віцебскага гарадскога промкамбіната; В. Е. Лабанок—ад полацкай комуністычнай арганізацыі; Е. Н. Мінава—ад калгаснікаў арцелі імені 17-га партыйнага з'езда, Рагачоўскага раёна, Гомельскай вобласці; Е. Н. Несцераў—ад калгаснікаў арцелі імені Першага мая, Бялыніцкага раёна, Магілёўскай вобласці; А. П. Шугурноў—ад Цэнтральнага Совета Асоавіяхіма БССР; Ф. І. Целеш—ад рабочых, служачых і інжынераў валкавыскага цэментнага завода „Перамога", Гродненскай вобласці. (ТАСС).

### ВЫКАНАЛІ ПЛАН ЗБОЖЖАНАРЫХТОВАК

Следуючы прыкладу перадавікоў, сяляне Першамайскага сельсовета на 21 лістапада выканалі гадавы план збожжанарыхтовак дзяржаве на 104,3 процанта.

Здача збожжа працягваецца звыш плана.

## Вывучаюць Палажэнне аб выбарах і даклад таварыша Молатава

У Аніскавіцкім сельсвеце шырыцца падрыхтоўка да выбараў у Вярхоўны Совет СССР. У сельс веце створан агіткалектыў, куда ўвайшлі лепшыя людзі сельсовета. Агіткалектывам кіруе ўпаўнаважаны РК КП(б)Б т. Шапавалаў. Ён рэгулярна для агітатараў робіць інструктыўныя даклады.

У вёсцы Старадубцы ёсць чырвоны куток. Ён аформлен плакатамі, лозунгамі. Сюда ўвечары сабіраюцца сяляне і з інтарэсам слухаюць агітатара Еўдакію Брашчук. Яна падрабязна растлумачвае выбаршчыкам кожны пункт Палажэння аб выбарах, расказвае аб правах выбаршчыкаў, якія запісаны ў Сталінскай Канстытуцыі. Добра працуюць і агітатары Фёдар Чэрнік, Лідзія Гуцава. Яны таксама пры вывучэнні Палажэння аб выбарах скарыстоўваюць і другія артыкулы з газет.

У пяці вёсках была праведзена чытка даклада таварыша Молатава на ўрачыстым паседжанні Маскоўскага Совета 6 лістапада.

Уся палітычна-масавая работа ўвязваецца з бягучымі задачамі, якія стаяць перад працаўнікамі вёскі. Наш сельсовет выканаў гадавы план хлебапаставак дзяржаве на 109, 1, але сяляне, пазнаёміўшыся з дакладам, абавязаліся працягваць здачу збожжа ў фонд Перамогі.

**Ф. Сцепанюк.**
Загадчык Аніскавіцкай хата-чытальні.

## МІЖНАРОДНЫ АГЛЯД

У радзе вазваленых краін Еўропы праходзяць выбары. Упершыню пасля вайны ўстанаўліваецца ў гэтых краінах законна выбіраемая ўлада. Да ўлады народ імкнецца ставіць усе партыі, якія здольны дзейнічаць у інтарэсах мас і ажыццяўляць прынцыпы дэмакратыі і міра.

Зусім зразумела, што гэта імкненне народных мас натыкаецца на процідзеянне рэакцыйных кругоў.

Рэакцыйны друк імкнуўся, напрыклад, паставіць пад сумненне свабодны характар выбараў у Югаславіі. Аднак поспех Народнага фронта ў гэтай краіне быў зусім бясспрэчным. Газета „Нью—Йорк таймс" назвала югаслаўскія выбары 11 лістапада „самымі чэснымі ў югаслаўскай гісторыі". Лонданская газета „Таймс" ацаніла вынік гэтых выбараў як „трыумф руху народнага вызвалення".

18 лістапада адбыліся выбары ў Балгарскі Народны Сход. Абстаноўка, у якой яны праходзілі, была вельмі складанай. Апазіцыя, якая аб'явіла байкот выбараў пад прадлогам адсутнасці неабходнай свабоды для правядзення выбарчай кампаніі, дабівалася ўстранення ўрада Айчыннага фронта і адтэрміноўвання выбараў.

За два дні да выбараў амерыканскі прадстаўнік у Балгарыі ўручыў балгарскаму прэм'ер-міністру ноту, у якой пацвярждалася пазіцыя ўрада Злучаных Штатаў Амерыкі, які адмаўляўся аднавіць дыпламатычныя зносіны з Балгарыяй.

У гэтай-жа ноце было выказана сумненне ў свабодным характары надыходзячых выбараў. У сваім адказе на гэту ноту балгарскі ўрад растлумачыў, што назначаныя на 18 лістапада выбары даюць балгарскаму народу шырокую магчымасць поўнасцю выказаць сваю волю.

Вынікі выбараў паказалі вялікую перамогу Айчыннага фронта. З 4,5 мільёнаў выбаршчыкаў у выбарах удзельнічала больш 3,8 мільёна чалавек—86 працэнтаў. З гэтага ліку—88,2 працэнта—звыш 3,4 мільёна чалавек—галасавалі за кандыдатаў Айчыннага фронта. Такім чынам курс апазіцыі на байкот выбараў праваліўся поўнасцю. Апазіцыя не змагла расколоць рады Айчыннага фронта.

* * *

21 кастрычніка ў Францыі адбыліся выбары ва Устаноўчы Сход. У гэтым Сходзе камуністы аказаліся самай шматлікай па свайму саставу групай, за імі па колькасці значацца прадстаўнікі народна-рэспубліканскага руху (католікі) і соцыялісты. Устаноўчы Сход уручыў мандат на стварэнне ўрада генералу дэ Голю. Яго папярэднія перагаворы з кіраўнікамі трох асноўных партый, з састава якіх павінен фарміравацца ўрад, не ўвенчаліся поспехам. Дэ Голь заявіў, што ён намерваўся сам размеркаваць партфелі ва ўрадзе і не пажадаў уручыць камуністам ніводнага з найбольш важных міністэрскіх партфеляў.

17 лістапада ў выступленні па радыё генерал дэ Голь паведаміў, што ён вярнуў Устаноўчаму Сходу мандат на фарміраванне ўрада, але пазней у пісьме на імя старшыні Устаноўчага Схода паведаміў, што ён меў на ўвазе рашыць—адбіраюць у яго гэты мандат, ці пацвярждаюць яго прадстаўленне пасля неўдачы першых перагавораў аб саставе ўрада.

19 лістапада на паседжанні Устаноўчага Схода галасавалася прапанова дэпутата Бомеля пацвердзіць паўнамоцтвы ўручаныя дэ Голю 13 лістапада. Соцыялісты ўнеслі папраўку, на якой дэ Голь павінен весці перагаворы з мэтай стварыць урад з прадстаўнікоў трох асноўных партый на роўных пачатках. У выніку галасавання прынята прапанова, якая пацвярждае паўнамоцтвы дэ Голя. Камуністы галасавалі супроць. Прынята таксама папраўка соцыялістаў. Камуністы ўстрымаліся пры галасаванні гэтай папраўкі.

Складанасць абстаноўкі, якая стварылася ў рабоце Устаноўчага Схода, у значнай ступені тлумачыцца той шыратой паўнамоцтваў, якія атрымлівае ў адпаведнасці з рэзультатамі рэферэндыума, глава ўрада пасля яго зацверджання Сходам.

**В. Грышанін.**

В.а. рэдактара
П. СПІРЫДОНАЎ